# ОТ РЕДАКЦИИ
# АД РЭДАКЦЫІ
# EDITORIAL

Для «Часопіса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія» 2019 г. юбілейны. Першы нумар выдання выйшаў у 1969 г. пад назвай «Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна. Серыя 4: Філалогія. Журналістыка», і гэта быў першы навуковы філалагічны часопіс у Беларусі. Арганізацыя новага перыядычнага выдання сведчыла аб выхадзе нашай *alma mater* на новы ўзровень і аб паспяховым развіцці беларускай навукі ў цэлым. Серыя часопіса «Філалогія. Журналістыка» ў пачатку 1970-х гг. пераўтварылася ў шматпрофільную і аб'яднала пад адной вокладкай працы філолагаў, журналістаў, педагогаў і псіхолагаў. У 1999 г. з серыі была выключана дысцыпліна «Псіхалогія». Найбольш важныя змены адбыліся ў 2017 г., калі сучасную форму набыў «Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія», які з'яўляецца правапераемнікам заснаванага паўстагоддзя назад выдання (у апошнія гады: «Веснік БДУ. Серыя 4: Філалогія. Журналістыка. Педагогіка»).

«Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія» з'яўляецца дзецішчам філалагічнага факультэта БДУ і сваім лёсам цесна з ім звязаны. Першым галоўным рэдактарам часопіса быў М. Г. Булахаў, у рэдакцыйную калегію ўваходзілі І. Я. Навуменка, Р. В. Булацкі, Ф. І. Куляшоў, М. Р. Ларчанка, Б. П. Міцкевіч, А. Я. Супрун, Л. М. Шакун, М. Я. Цікоцкі – людзі, якія склалі гонар і славу беларускай філалогіі і журналістыкі. На працягу 50 гадоў часопіс з'яўляецца трыбунай для навуковага абмеркавання разнастайных філалагічных праблем як прадстаўнікамі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, так і супрацоўнікамі іншых беларускіх і замежных універсітэтаў, а таксама Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Названыя асобы, а таксама новыя генерацыі рэдактараў спрыялі таму, што часопіс трывала сцвердзіўся на беларускім рынку навуковых філалагічных выданняў.

Натуральна, найбольш каштоўны рэсурс часопіса – гэта яго аўтары, якія на старонках выдання дзеляцца з чытачом вынікамі сваіх даследаванняў. На працягу гісторыі філалагічная серыя часопіса спрыяла падрыхтоўцы і выхаванню соцень высокакваліфікаваных навуковых кадраў. Рэдакцыйная калегія і надалей зацікаўлена ў супрацоўніцтве з аўтарамі, якія сваімі працамі абагачаюць бачанне розных актуальных праблем філалогіі.

Новы час ставіць перад рэдактарамі і аўтарамі часопіса новыя выклікі. Рэдакцыя «Часопіса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія» ў сваёй дзейнасці кіруецца міжнароднымі стандартамі, распрацаванымі Камітэтам этыкі навуковых публікацый (*The Committee on Publications Ethics*), прымае пад увагу практыку аўтарытэтных міжнародных часопісаў і выдавецтваў. У прыватнасці, на іншых падставах у параўнанні з ранейшай практыкай праводзіцца рэцэнзаванне рукапісаў, якія паступаюць у рэдакцыю. Рэдкалегія выказвае вялікую ўдзячнасць калегам з іншых беларускіх і замежных універсітэтаў, якія дзеляцца сваім вопытам і кваліфікацыяй у працэсе экспертызы артыкулаў, якія атрымлівае часопіс.

У параўнанні з веснікам, які пачынаўся толькі як часопіс беларусістыкі, русістыкі і славістыкі, профіль сучаснага «Часопіса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія» намнога шырэйшы. І далей наш часопіс захавае шырокую філалагічную спецыялізацыю і будзе змяшчаць на сваіх старонках матэрыялы, цікавыя міжнароднаму чытачу.